# КАБ НЕ ГАЛАДАЛІ ПТУШКІ, БУДЗЕМ ІМ РАБІЦЬ КАРМУШКІ *(Міхась Пазнякоў)*



— Бачыш, Васілінка, колькі кармушак для птушак змайстравалі дзеці! — сказаў Лянок.

— Гэта вельмі добра. Але чамусьці ў кармушку яны часам забываюцца насыпаць корм для птушак. Кармушкі не парадуюць птушак, калі яны пустыя...

Раскажыце, як вы клапоціцеся пра птушак зімой.


Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

❍ Пакармі птушак зімой, яны аддзячаць табе вясной.

Прачытайце назву апавядання. Як вы думаеце, пра што пойдзе ў ім гаворка?

## Чырвоныя гронкі рабіны

*Рыгор Ігнаценка*

На бярозе каля школы вісіць кармушка. Разам з настаўніцай вучні назіраюць, як жаўтагрудыя сініцы з вераб'ямі дзяўбуць хлебныя крошкі.

— Ганна Паўлаўна, — пытае Лёня, — чаму снегіроў няма?

Настаўніца адказала:

— Яны хлеба не ядуць. Снегіры любяць ягады: бузіну́, рабі́ну, крушы́ну.

Рабіну! Тут толькі Лёня ўспомніў пра ягады, якія яны схавалі са Сцёпам.

Пагодлівым асеннім ранкам хлопчыкі гулялі па лесе. На светлай прагалінцы нарвалі рабіны. Па-ка-шта-ва́-лі, а яна горкая,

Правообладатель Национальный институт образования



у рот не ўзяць. Хлопчыкі сха-ва-лі ягады пад дрэвам, накрылі зялёным мохам, спадзе-ю-чы́-ся забраць зімой, калі яны пе-ра-ме́р-знуць.

У той жа дзень пасля заняткаў сябрукі на лыжах паехалі ў лес. Яны адшукалі дрэва, пад якім былі схаваны ягады рабіны, і пачалі капаць снег.

— Ура! Цэлая! — усклікнуў Лёня і пакаштаваў. Ягады былі смачныя, салодкія. Хлопчыкі забралі іх і памчаліся дахаты. Дома павяза́лі рабіну ў невялікія пучкі і павесілі на гарышчы. А некалькі чырвоных гронак зане́слі на кармушку.

Назаўтра Лёня са Сцёпам першыя прыбеглі ў школу. Глядзяць — снегіры на кармушцы. Сядзяць і пава́жна дзяўбуць ягады рабіны.


Правообладатель Национальный институт образования

Падыходзілі вучні і з цікавасцю глядзелі на чы-рва-на-гру́-дых гасцей.

Са школы выйшла настаўніца.

— Ганна Паўлаўна, снегіры! — закрычалі дзеці.

— Хочаце іх кожную зіму бачыць? — спытала настаўніца.

— Хочам.

— Тады давайце вясной шмат сваіх рабінак пасадзім каля школы.

1. Чаму снегіры не прыляталі на кармушку?
2. Раскажыце, як Лёня і Сцёпа адшукалі ягады рабіны.
3. Як аўтар перадае радасць хлопчыкаў ад зробленай добрай справы?
4. Што трэба зрабіць, каб бачыць снегіроў кожную зіму?
5. Падзяліце тэкст на часткі па плане. Перакажыце твор.

П л а н

1. Чаму на кармушцы няма снегіроў?
2. Дзе схаваны ягады рабіны?
3. Снегіры на кармушцы!
4. Хочаце кожную зіму бачыць снегіроў?

Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце апошнюю частку апавядання. Складзіце працяг твора пра тое, як вучні пасадзілі маладыя рабінкі. Хто ім дапамагаў? Што адбылося праз некалькі гадоў?

Разгледзьце малюнак. Што здарылася? Як вы думаеце чаму? Паслухайце апавяданне.



## Галка

*Васіль Хомчанка*

У агародчыку зляпіў я Дзеда Мароза са снегу. Дзе вочы — чорныя вугольчыкі ўторкнуў. А нос зрабіў з вялікай жоўтай морквы.

У рукі Дзеду Марозу даў скры́начку і насы́паў туды зярнят.

— Часту́й птушак, — сказаў я яму, а сам зайшоў у хату і стаў каля акна.

Прыляцела першая сінічка. Пі́скнула, села на край скрыначкі, дзеўбану́ла раз, другі. Потым снягір апусціўся побач. А нахабны верабей залез у кармушку з нагамі.

Чорная галка з бярозы таксама заўважыла кармушку. Пераляцела на самую ніжнюю


Правообладатель Национальный институт образования

галінку, але спусціцца на кармушку не адва́жылася. Пакуль галка сядзела так ды а-гля́-два-ла-ся, птушкі ўсё па-дзяў-блі і ра-зля-це-лі-ся.

Галка скокнула ў кармушку, а ў кармушцы пуста. Яна са злосці схапіла дзюбай моркву і паляцела з ёю.

І Дзед Мароз застаўся без носа.



1. Прачытайце, як выглядаў Дзед Мароз. Якую важную справу ён «выконваў»?
2. Якія птушкі прыляталі на кармушку? Прачытайце, як яны сябе паводзілі.
3. Чаму галцы засталася толькі морква? Знайдзіце і прачытайце радкі твора, якімі можна падпісаць ілюстрацыю.
4. Чаму аўтара, які паведаміў гэту гісторыю, можна назваць клапатлівым чалавекам?
5. Навучыцеся выразна чытаць апавяданне.

Правообладатель Национальный институт образования